УДК 801.32

В.К. Шчэрбін

Мова навукі і славянская перакладная тэрмінаграфія

Розныя бакі сучаснай навукі з'яўляюцца аб'ектам даследавання для шэрага гуманітарных дысцыплін (філасофіі, гісторыі, сацыялогіі, эканомікі, мовазнаўства, навуказнаўства і інш.), паміж якімі існуюць пэўныя лагічныя сувязі. Асабліва цеснымі адзначаныя сувязі з'яўляюцца паміж такім напрамкам навуказнаўства, як мова навукі, і такім напрамкам мовазнаўчай навукі, як тэрмінаграфія. Вынікі дыяхранічнага вывучэння працэсу фарміравання ўказаных напрамкаў паказваюць, што чым больш развітой, разгалінаванай і ўсё больш спецыялізаванай становіцца сучасная Навука ў цэлым, тым больш багатай і разнастайнай робіцца яе мова, тым большая колькасць спецыяльных слоўнікаў патрабуецца для апісання і вывучэння шматлікіх падмоў гэтай навуковай мовы. Як слушна заўважыў на гэты конт маскоўскі тэрміограф Ю.Н. Марчук, «тэрміналагічная лексікаграфія (тэрмінаграфія) з'яўляецца паследкам і адначасова неабходнай умовай навукова-тэхнічнага прагрэсу. У тэрміналагічных слоўніках фіксуюцца элементы навуковых ведаў, без якіх навуковыя і тэхнічныя даследаванні і распрацоўкі немагчымыя» [1].

На наш погляд, менавіта моцным уплывам пазалінгвістычных фактараў, такіх як імклівае (інтэнсіўнае і экстэнсіўнае) развіццё сусветнай навукі і ўсё больш хуткая інтэграцыя атрыманых ёю вынікаў у эканоміку найбольш развітых краін свету, шматаспектная глабалізацыя і інтэрнацыяналізацыя сучаснага жыцця і інш., тлумачыцца хуткае пашырэнне ў славянскіх краінах выпуску тэрміналагічных слоўнікаў. Для прыкладу, у першым томе бібліяграфічнага даведніка «Славянскія слоўнікі» Р.С. Ліванскага (Нью-Йорк, 1962), прысвечанага агляду польскай лексікаграфіі, падаюцца звесткі аб 71 тэрміналагічным слоўніку польскай мовы, якія выдаваліся на працягу 1825-1958 гадоў [2]. Інакш кажучы, за больш чым 130 гадоў апублікавана толькі сем дзесяткаў польскіх даведнікаў па тэрміналагічнай лексіцы, г.зн. у сярэднім адзін спецыяльны даведнік у два гады. У сваю чаргу, з манаграфіі вядомых тэрмінолагаў У.М. Лейчыка і Л. Бесекірскай «Тэрміназнаўства: прадмет, метады, структура» (Беласток, 1998) можна даведацца, што ў сённяшняй Польшчы толькі на працягу аднаго дзесяцігоддзя (1987-1997 гады) і толькі ў галіне эканамічных ведаў апублікавана каля 70 спецыяльных слоўнікаў [3]. Інакш кажучы, ва ўказаны перыяд кожны год публікавалася ў сярэднім сем польскіх даведнікаў толькі па эканамічнай тэрміналогіі. Такім чынам, дзякуючы праведзенаму параўнанню тэрмінаграфічных набыткаў розных храналагічных перыядаў, імкпівае павелічэнне колькасці тэрміналагічных слоўнікаў, выдадзеных у Польшчы у апошнія дзесяцігоддзі, становіцца відавочным.

Аналагічныя храналагічныя параўнанні ажыццяўляліся намі і на матэрыяле беларускай, рускай і ўкраінскай тэрмінаграфій, і вынікі такіх параўнанняў таксама сведчаць аб хуткім пашырэнні выпуску спецыяльнай даведачнай літаратуры ў гэтых усходнеславянскіх краінах. У выніку гэтага пашыранага выпуску тэрміналагічных слоўнікаў сучасныя бібліяграфічныя даведнікі па беларускай, рускай і ўкраінскай лексікаграфіі ўключаюць назвы многіх соцень і нават тысяч спецыяльных слоўнікаў. *Для даведкі*: 1) у рабоце І.М. Каўфмана

«Тэрміналагічныя слоўнікі. Бібліяграфія» (М., 1961) апісаны 1755 спецыяльных слоўнікаў; 2) у бібліяграфічным дадатку «Навукова-тэхнічныя слоўнікі 1931-1987» да зборніка артыкулаў «Тэорыя і практыка навукова-тэхнічнай лексікаграфіі» (М., 1988) падаецца інфармацыя пра 590 тэрміналагічных слоўнікаў рускай мовы [4]; 3) складзеная харкаўскімі даследчыкамі У.У. Дубічынскім, А.А. Сідарэнкам і В.Ф. Сухапар «Бібліяграфія ўкраінскіх слоўнікаў (1990-1997)» уключае назвы 145 тэрміналагічных слоўнікаў [5]; 4) бібліяграфічны даведнік В. Кілеля і З. Саўкі «Беларускія слоўнікі і энцыклапедыі» (Нью-Йорк, Мн., 2002) змяшчае звесткі пра 570 тэрміналагічных слоўнікаў [6].

Пры гэтым сучасная славянская тэрмінаграфія ўражвае кожнага, хто знаёміцца з яе ранейшымі і апошнімі напрацоўкамі, не толькі колькасцю апублікаваных тэрміналагічных даведнікаў, але і разнастайнасцю тыпалагічных характарыстык лексікаграфічных прац, створаных у яе рамках. У прыватнасці, падрыхтаваныя беларускімі, польскімі, рускімі і ўкраінскімі тэрміналографамі спецыяльныя слоўнікі паводле змяшчаемых імі лексікаграфічных параметраў можна размеркаваць паміж трыма дзесяткамі існуючых напрамкаў сучаснай тэрміналагічнай лексікаграфіі, такіх, як гістарычная, народна-дыялектная, энцыклапедычная, вучэбная, перакладная, тлумачальная, статыстычная, арфаграфічная, праектыўная, апісальная, нарматыўная, этымалагічная, неалагічная, фразеалагічная, корпусная, электронная тэрмінаграфія і інш.

Дакладных межаў паміж вышэйпамянёнымі тэрмінаграфічнымі напрамкамі не існуе, паколькі канкрэтны тэрміналагічны даведнік можа адначасова змяшчаць у сабе самыя розныя лексікаграфічныя параметры (дэфініцыйны, перакладны, этымалагічны, нарматыўны і многія іншыя) і ў адпаведнасці са змяшчаемымі лексікаграфічнымі параметрамі можа адносіцца да розных тэрмінаграфічных напрамкаў. У якасці канкрэтнага прыкладу такога комплекснага спецыяльнага слоўніка прывядзем выдадзены ў 1999 годзе на рускай мове першы ў краінах СНД энцыклапедычны даведнік «Генетыка», складзены мінскімі вучонымі-генетыкамі М.А. Картэлем, А.М. Макеевай і віцебскім мовазнаўцам Г.М. Мезенкай. Гэты фундаментальны спецыяльны даведнік змяшчае каля 5 тысяч разгорнутых энцыклапедычных артыкулаў, у якіх ракрываецца сутнасць ключавых генетычных паняццяў, даецца шматбаковая прадметная характарыстыка тым навуковым з'явам, што стаяць за гэтымі паняццямі (па нашых падліках, толькі апісанняў найноўшых генетычных метадаў у ім налічваецца звыш 160 адзінак!). Разам з тым, поруч з кожным рэестравым рускім тэрмінам падаецца і яго англійскі адпаведнік, што, безумоўна, надае гэтаму энцыклапедычнаму даведніку рысы перакладнога слоўніка. Запланавана выданне і беларускамоўнага варыянта ўказанага даведніка. Калі ён выйдзе, то гэта будзе ўжо трохмоўны энцыклапедычны слоўнік новага тыпу, таму што большасць трохмоўных спецыяльных слоўнікаў з'яўляюцца чыста перакладнымі даведнікамі. У якасці прыкладу такога тыповага трохмоўнага тэрміналагічнага даведніка перакладнога тыпу можна прывесці складзены беларуска-польскім калектывам аўтараў «Слоўнік тэрміналогіі лінгвістычнай (беларуска-расійска-польскі і польска-расійска-беларускі)» (Беласток, 1994).

Разам з тым, пры паглыбленым вывучэнні зместу таго або іншага спецыяльнага слоўніка ў выпадку неабходнасці можна вызначыць той лексікаграфічны параметр, які рэалізуецца ў ім больш паслядоўна (у параўнанні з іншымі прадстаўленымі ў гэтым слоўніку параметрамі) і ў выніку гэтага з'яўляецца дамінантным для дадзенага слоўніка, г.зн. такім, які вызначае тып слоўніка. Аднак у дадзеным даследаванні нас цікавілі не столькі дакладныя таксанамічныя характарыстыкі канкрэтных тэрміналагічных

слоўнікаў, колькі магчымасць вызначэння ўзроўню распрацаванасці таго або іншага тэрмінаграфічнага напрамку па колькасці спецыяльных слоўнікаў, у якіх прадстаўлены той лексікаграфічны параметр, што даў назву гэтаму напрамку. І ў гэтым сэнсе самым распрацаваным напрамкам у межах сучаснай славянскай тэрміналагічнай лексікаграфіі, безумоўна, з'яўляецца *перакладная тэрмінаграфія*.

На карысць выводу аб высокім узроўні распрацаванасці гэтага тэрмінаграфічнага напрамку ў славянскім мовазнаўстве можна прывесці наступныя аргументы:

1. У рамках кожнай асобна ўзятай нацыянальнай тэрмінаграфіі (беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай) перакладны параметр прысутнічае больш чым у палове ўсіх апублікаваных спецыяльных даведнікаў. Напрыклад, з пададзеных у згаданым вышэй бібліяграфічным дадатку «Навукова-тэхнічныя слоўнікі 1931-1987» 590 тэрмінапагічных слоўнікаў рускай мовы перакладнымі (двухмоўнымі і шматмоўнымі) можна лічыць 588 даведнікаў. У сваю чаргу, сярод уключаных у «Бібліяграфію ўкраінскіх слоўнікаў (1990-1997)» 145 тэрміналагічных слоўнікаў пераважную большасць (124 назвы) складаюць даведнікі, у якіх прадстаўлены перакладны параметр. Нарэшце, са змешчаных у бібліяграфічным даведніку «Беларускія слоўнікі і энцыклапедыі» 570 тэрміналагічных слоўнікаў 333 адзінкі (58% ад усёй колькасці) маюць дачыненне да перакладных даведнікаў. Для параўнання адзначым, што ў той жа выбарцы беларускіх спецыяльных даведнікаў (570 назваў) дэфініцыйны (ці тлумачальны) параметр прысутнічае ў 164 слоўніках (29% ад усёй колькасці), вучэбны параметр – у 70 даведніках (12,3%), дыялектны параметр – у 42 слоўніках (7,4%), гістарычны параметр – у 27 (5%) і энцыклапедычны параметр – у 13 спецыяльных слоўніках (2,3%). Астатнія лексікаграфічныя параметры (статыстычны, арфаграфічны, неалагічны, фразеалагічны і інш.), якія далі назву адпаведным тэрмінаграфічным напрамкам, прадстаўлены толькі ў адзінкавых тэрміналагічных слоўніках з абследаванай слоўнікавай выбаркі.

2. Найбольшай паўнатой рэестра сярод славянскіх тэрміналагічных слоўнікаў вызначаюцца менавіта перакладныя даведнікі. Напрыклад, чацвёртае выданне «Вялікага польска-рускага політэхнічнага слоўніка» (Варшава-М., 1976) уключае каля 120 тысяч рэестравых тэрмінаў; «Расійска-ўкраінскі агульнатэхнічны слоўнік» Л.І. Мацько, І.Г. Трэгуб, В.Ф. Хрысцёнак (Кіеў, 1994) падае каля 113 тысяч рэестравых тэрміналагічных адзінак; трохтомны акадэмічны «Расійска-ўкраінскі слоўнік навуковай тэрміналогіі» («Грамадскія навукі», 1994; «Біялогія, хімія, медыцына», 1996; «Матэматыка. Фізіка. Тэхніка. Навукі пра Зямлю і Космас», 1998), выдадзены ў Кіеве, напічвае ў сваім рэестры звыш 300 тысяч тэрмінаў і номенаў; рэестр двухтомнага акадэмічнага «Руска-беларускага політэхнічнага слоўніка» (Мн., 1997-1998) змяшчае каля 157 тысяч тэрмінаў па розных галінах навукі і тэхнікі. Больш таго, па паўнаце рэестра самыя вялікія славянскія тэрміналагічныя слоўнікі перакладнога тыпу пераўзыходзяць нават многатомныя акадэмічныя тлумачальныя слоўнікі агульналітаратурнай лексікі. *Для даведкі:* 1) рэестр 17-томнага «Слоўніка сучаснай рускай літаратурнай мовы» (М.-Л., 1948-1965) уключае 120480 слоў; 2) у 11-томным «Слоўніку мовы польскай» (Варшава, 1958-1969) падаецца каля 128 тысяч рэестравых слоў; 3) 11 тамоў акадэмічнага «Слоўніка ўкраінскай мовы» (Кіеў, 1970-1980) змяшчаюць звыш 134 тысяч рэестравых адзінак; 4) 5-томны (у шасці кнігах) «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (Мн., 1977-1984) налічвае ў сваім рэестры каля 105 тысяч слоў.

Выключнае рэестравае багацце перакладных тэрміналагічных слоўнікаў славянскіх моў абумоўлена наступнымі прычынамі. У адрозненне ад спецыяльных даведнікаў тлумачальнага тыпу, якія ставяць сваімі мэтамі

1) максімальна поўнае вызначэнне зместу кожнага рэестравага тэрміна і 2) дакладнае ўказанне месца рэестравага тэрміна ў адпаведнай тэрмінасістэме з яе нацыянальна акрэсленымі межамі (апошнія абумоўлены пералікам канкрэтных праблем і напрамкаў, распрацоўваемых пэўнай нацыянальнай навукай), спецыяльныя слоўнікі перакладнога тыпу ставяць перад сабой зусім іншыя мэты: 1) як мага больш поўна ахапіць паняційнае багацце рознанацыянальных навуковых школ і напрамкаў, 2) узбагаціць сваю нацыянальную навуку за кошт увядзення новых паняццяў, пазычаных з даследчыцкай практыкі вучоных найбольш развітых у навуковых адносінах краін свету, 3) адшукаць ці стварыць для кожнага новага навуковага паняцця свой тэрміналагічны адпаведнік.

Такім чынам, прааналізаваныя аргументы і прычыны сведчаць, што менавіта славянская перакладная тэрмінаграфія з'яўляецца сёння галоўным каналам папаўнення паняційнага і тэрміналагічнага фондаў розных славянскіх моў, а таксама асноўнай інфармацыйнай базай для развіцця ўсіх іншых тэрмінаграфічных напрамкаў у славянскім мовазнаўстве. Пры гэтым, аднак, трэба адзначыць, што апрацоўкай спецыяльнай лексікі ў рамках кожнай асобнай галіны ведаў займаюцца сёння пераважным чынам не мовазнаўцы-тэрміграфы, а спецыялісты саміх гэтых галін ведаў. Як слушна заўважыў на гэты конт маскоўскі даследчык Я.М. Верашчагін, «кожная навука развівае ўласную галіновую лексікаграфію» [7]. З аднаго боку, гэта добра, што адбор навуковых паняццяў для тэрміналагічнага слоўніка ажыццяўляюць спецыялісты-прадметнікі, якія штодня карыстаюцца гэтымі паняццямі ў сваёй навуковай дзейнасці, а таму адбіраюць у слоўнік самыя патрэбныя з іх. З другога боку, гэтыя спецыялісты не заўсёды валодаюць лексічнымі, граматычнымі, словаўтваральнымі і іншымі нормамі роднай мовы ў тым немалым аб'ёме, які патрабуецца для дакладнай семантызацыі, уніфікацыі і кадыфікацыі тэрміна. Менавіта гэтым тлумачыцца празмернае выкарыстанне ў сучасных тэрміналагічных слоўніках славянскіх моў шматлікіх англіцызмаў, асобных архаізмаў, дыялектызмаў, жарганізмаў і нават прастамоўных выразаў.

На наш погляд, наспеў час усім славянскім мовазнаўцам як мага шырэй уключыцца ў справу нармалізацыі спецыяльнай лексікі розных галін навуковых ведаў, у тым ліку і праз асабісты ўдзел у складанні тэрміналагічных слоўнікаў. У процілеглым выпадку, калі мовазнаўцы і надалей будуць стаяць у баку ад тэрмінаграфічнай справы, лічачы яе перыферыйнай, другараднай (у параўнанні з агульнай нарматыўнай лексікаграфіяй), то праз пэўны час перапічаныя вышэй разрады ненарматыўнай лексікі набудуць пашырэнне ў сферы лексікаграфічнай фіксацыі, а потым стануць і агульнай моўнай нормай. І мовазнаўцам толькі застанецца выступаць у ролі рэгістратараў таго, што моўная норма ў чарговы раз змянілася і зноў не самым сістэмным чынам.

Добры прыклад таго, як трэба ставіцца да тэрмінаграфічнай справы, на Беларусі падаюць віцебскія мовазнаўцы. Сярод найбольш грунтоўных спецыяльных слоўнікаў, створаных з іх удзелам, варта адзначыць вышэйпамянёны энцыклапедычны даведнік «Генетыка», трохмоўны (руска-беларуска-лацінскі і беларуска-рускі) слоўнік «Біялагічная тэрміналогія і наменклатура» У.А. Радкевіча, Л.М. Вардамацкага, А.А. Ляшко (Мн., 1993) і інш.

У міждысцыплінарным даследаванні Г.Д. Гачава слушна адзначаецца, што любое навуковае выданне можна «разглядаць не толькі як прапанову нейкіх тлумачэнняў з'явы прыроды, але як факт навуковай літаратуры, г.зн. як тэкст, як род славеснасці» [8]. Таму калі мовазнаўцы скарыстаюць свае прафесійныя навыкі працы з мастацкімі, вучэбнымі і іншымі тэкстамі для таго, каб ажыццявіць франтальную распіску найбольш значных навуковых тэкстаў з розных галін ведаў і скласці па выніках гэтай распіскі галіновыя тэрміналагічныя слоўнікі, то гэтым

самым яны не толькі зробяць важкі ўклад у развіццё славянскай тэрмінаграфіі, але і паспрыяюць стварэнню шматаспектнага навуказнаўчага апісання мовы навукі як спецыфічнай галіны чалавечай дзейнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Марчук Ю.Н.*** Основы терминографии. М., 1992. С. 18.
2. ***Lewanski R.C.*** A Bibliography of Slavic Dictionaries. Vol. I: Polish. N.Y., 1962. S. 14-17.
3. ***Lejczyk W., Biesiekirska L.*** Terminoznawstwo: przedmiot, metody, struktura. Bialystok, 1998. S. 152.
4. ***Научно-технические словари 1931-1987*** // Теория и практика научно-технической лексикографии: Сб. статей. М., 1988. С. 278-301.
5. ***Дубічинський В.В., Сидоренко А.А., Сухопар В.Ф.*** Бібліографія українських словників (1990-1997) // Вестник Международного славянского университета. Харьков, 2000, т. 3, № 1. С. 12-18.
6. ***Кіпель В., Саўка З.*** Беларускія слоўнікі і энцыклапедыі: Бібліяграфія. Нью-Йорк, Мн., 2002. С. 472-473.
7. ***Верещагин Е.М., Костомаров В.Г.*** Лингвострановедческая теория слова. М., 1980. С. 216.
8. ***Гачев Г.Д.*** Наука и национальные культуры (гуманитарный комментарий к естествознанию). Ростов-на-Дону, 1992. С. 312.

SUMMARY

The problem of interdependence between scientific language as the science of science's trend and the slavic special lexicography is investigated. On the ground of analysis of the slavic lexicographic bibliographies a conclusion is made that the most developed trend in the slavic special lexicography is the bilingual termography. Taking into account a great importance of the special bilingual dictionaries for the further description of scientific language, a proposal to all linguists is made to take active part in compiling of such dictionaries.

Поступила в редакцию 25.06.2003